МІНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ КАЛЕДЖ МАСТАЦТВАЎ

ТВОРЧАЯ РАБОТА
# **“НАСТАЎНІК У МАІМ ЖЫЦЦІ”**

Выканала
Гілеўская Валерыя,
навучэнка групы 2 м/х

Мінск, 2023

– Зорачка мая, вітаю. Слухай, я па сур'ёзнай справе да цябе. Тут форс-мажор на форс-мажоры! Зможаш сёння ў маіх малых заняткі правесці? Яны ціхія, паслухмяныя, патанцуеце з імі крыху. Я ўпэўнена, што ўсё будзе добра. Зможаш?

– Так, канешне…

Ніколі не думала, што мая педагагічная дзейнасць пачнецца так нечакана. Як наогул адчуваць сябе настаўнікам, узяць адказнасць за гэтыя маленькія галовы, якія пакуль што хвалююць толькі цукеркі? Я яшчэ сама такая ж малая, шмат чаго не ўмею, а тут павінна перадаваць свае веды камусьці, хто, як губка, убярэ да апошняй кропелькі кожны рух, кожнае слова.

Села рыхтавацца, дастала нататнік. Буду пісаць план урока. Узгадваю сябе ў такім ўзросце: чым мы звычайна займаліся? У мяне была неверагодная настаўніца, якая пазнаёміла мяне з харэаграфіяй. Любяць гаварыць, што школьныя секцыі ніколі не дацягваюць да прафесійнага ўзроўню. Я гатова спрачацца і даказваць, што гэта лухта. З маёй Вольгай Уладзіміраўнай у мяне не паварочваецца язык назваць гэта "гурток". Гэта быў самы сапраўдны і ніколькі не аматарскі ансамбль. Яна заклала такі падмурак, што нават зараз я з такой цеплынёй і пяшчотай узгадваю нашыя заняткі, канцэрты. Яна была першай, хто даваў вучням самастойна ставіць нумары і выступаць з імі. Дзякуючы гэтаму, мне здаецца, я магу ствараць танцы зараз з лёгкасцю, не задумваючыся і не заганяючы сябе ў межы. А што самае галоўнае, яна паказала, што недастаткова быць класным настаўнікам, больш важна быць добрым чалавекам. Тады і заняткі будуць праходзіць лёгка, і дзеці пранікнуцца справай, якой займаюцца, і, дакладна, будуць пэўныя вынікі. А месцы на конкурсах мы займалі заўсёды прызавыя. Людзі думалі, што гэта праз жорсткую дысцыпліну, але не. У нас усё атрымлівалася, бо да нас ставіліся з павагай і любілі, як сваіх дзяцей.

Тут ужо ўзгадваецца мая настаўніца пачатковай школы, якая і параіла пайсці на, як мы называлі, "танцы", якія потым змянілі маё жыццё. Да Вольгі Віктараўны была страшэнная чарга, бо ўсе хацелі вучыцца толькі ў яе. Калі яна рабіла новы набор, то школа "гудзела", а бацькі начавалі каля кабінета, каб першымі ўнесці імя ў спіс. Мне пашанцавала, я вучылася ў яе. Нам казалі: "Пасля Кашчэевай табе ўсе шляхі адкрыты". Калі зараз азіраюся назад, то разумею, што, можа, мовам, матэматыцы яна вучыла звычайным чынам, але яна дала мне самае галоўнае: яна навучыла мяне вучыцца! Рабіць гэта хутка, з агеньчыкамі ў вачах. Калі не пашанцавала з выкладчыкам – нічога, дзякуючы ёй я ўмею самастойна знаходзіць якасную інфармацыю і ўкладаць сабе ў галаву. Яна дала самае карыснае, што магла даць. Гэта, як кажуць: "Дай чалавеку рыбу, і ён будзе сыты адзін дзень. Навучы чалавека вудзіць, і ён будзе сыты да канца жыцця".

Калі размова заходзіць пра школу, я не магу не ўзгадаць сваю выкладчыцу англійскай мовы – непаўторную Наталлю Ігараўну. Ёй і толькі ёй я ўдзячная за свае веды і магчымасць свабодна размаўляць на замежнай мове. Але як мы яе баяліся спачатку! Заўсёды сур'ёзная, ніколі не смяецца. А якія плёткі пра яе хадзілі па школе! Мы ішлі на яе заняткі і дрыжалі ад жаху. На нас

ніколі не сварыліся, не павышалі голас, але ўмелі паглядзець “такім” позіркам, што можна было пачынаць пісаць завяшчанне. Так было два першыя гады (вучылася ў яе я сем гадоў), а потым яна паступова пачала адтайваць. Урокі пачалі праходзіць у больш расслабленай атмасферы, мы маглі і пажартаваць, але, як і раней, адказна рыхтаваліся да заняткаў. Мы сталелі, яна больш пранікалася намі. У старэйшых класах да яе можна было прыйсці і проста паразмаўляць пра жыццё. Яна гатавала каву (гэта ўсё яшчэ самая смачная кава, якую я піла), і мы маглі да позняга вечара гутарыць, тэмы не заканчваліся. Яна раіла нам нешта – цікава, што і мы ёй таксама. А потым вельмі доўга не маглі разысціся. Зараз я ўзгадваю яе як самую чалавечную і мудрую настаўніцу ў маім жыцці. Яна ўмела тое, што я вельмі хачу рабіць у сваім будучым педагагічным лёсе. Яна сумяшчала і ролю строгага выкладчыка, да якога паспрабуй прыйсці непадрыхтаваным, і ролю сябра, якому можна даверыць сакрэт і быць упэўненым, што табе дапамогуць. Я ўжо скончыла школу, але зараз Наталля Ігараўна вучыць маю малодшую сястру, і я вельмі рада гэтаму. Мая малодшая атрымлівае якасныя веды, а мне часам прылятаюць “вітанкі” ад лепшай выкладчыцы англійскай мовы.

Зараз я вучуся ў каледжы мастацтваў і вельмі задаволеная тым, да каго трапіла на курс. Алена Дзмітрыеўна – гэта той выкладчык, пасля якога ты дакладна выйдзеш крутым спецыялістам. Яна навучыць не толькі танцаваць, ствараць, але і як паводзіць сябе ў жыцці. За што я яе вельмі люблю: яна не хавае таго, што такі ж чалавек, як і мы. Яна можа не ведаць чагосьці, у яе можа не атрымлівацца, яна можа сумаваць – і гэта ўсё нармалёва. Яна адрозніваецца ад нас толькі колькасцю ведаў і жыццёвага досведу. Мы можам разам шукаць адказы, альбо яна можа звяртацца да нас, вучняў, калі ведае, што хтосьці разбіраецца ў гэтым лепш за яе. У гэтым і фішка – у чалавечнасці. Я яшчэ вучуся і стараюся ўвабраць як мага больш таямніц выкладання харэаграфіі ад Алены Дзмітрыеўны. Упэўнена, што пасля яе куратарства выйду не толькі прафесійным харэографам, але і добрым чалавекам.

Так я прасядзела за сталом больш за дзве гадзіны, у нататніку не з’явілася плана ўрока, які я павінна правесці, але з’явіўся невялічкі запіс:

*Якім я хачу быць настаўнікам:*

*1) Любіць дзяцей, як Вольга Уладзіміраўна.*

*2) Заахвочваць вучняў сваёй справай, як Вольга Віктараўна.*

*3) Даваць такія ж якасныя веды, трымаць дысцыпліну і заставацца для вучняў сябрам, як Наталля Ігараўна.*

*4) Заставацца чалавекам, як Алена Дзмітрыеўна.*

*5) З усіх сіл старацца стаць лепшым настаўнікам, як раблю гэта я.*